# Беларуская мініяцюрная кніга
# ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Адной з цікавых калекцый кніг любой бібліятэкі, якая прыцягвае ўвагу як дарослага, так і дзіцячага наведвальніка, з'яўляецца калекцыя мініяцюрных выданняў. Нацыянальная бібліятэка Беларусі валодае даволі разнастайнай і багатай калекцыяй мінікніг. Мэтанакіраванае збіранне такіх кніг ажыццяўляецца навукова-даследчым аддзелам кнігазнаўства. У сучасны час калекцыя мініяцюрных выданняў адзела кнігазнаўства налічвае каля 2000 экзэмпляраў, не ўлічваючы старадрукаваных выданняў, у прыватнасці мініяцюрных і малафарматных кніг Эльзіviraў і іншых заходнееўрапейскіх выдаўцоў.

Пачэснае месца сярод мініяцюрных выданняў калекцыі аддзела кнігазнаўства займае беларуская. Першая беларуская мініяцюрная кніга была надрукавана ў 1833 г. у Мінску ў тыпаграфіі Сцефановіча. Выданне называлася *Подарок благонравным ученикам и ученицам на новый 1834 год, или Нравоучительные детские повести, служащие к образованию ума и сердца*. На жаль, выданне зберагаецца ў аддзеле рэдкіх кніг Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. У НДА кнігазнаўства захоўваецца мікрафільм выдання.

З дарэвалюцыйных беларускіх мініяцюрных кніг, якія захоўваюцца ў фондзе аддзела, неабходна адзначыць віленскае выданне: *Kantyczka czyli pieśni nabożne w kościele katolickim używane* ( Wilno, 1878).

Першай мініяцюрнай кнігай, надрукаванай у Савецкай Беларусі доўгі час лічылася *Канстытуцыя* БССР, якая была выпушчана ў 1948 г. у Баранавічах тыражом 50 экзэмпляраў. Памер кнігі складае 60х45 мм. Аднак на самой справе яшчэ ў даваенны час былі надрукаваны на беларускай мове дзве кніжкі. Адна ў 1930 г. у Гомелі - ***XXIII*** *Дзяржынская раенная партканферэнцыя (3-7 мая 1930 г.)* - у колькасці 2 тыс. экзэмпляраў. Другая ў 1932 г. у Мінску - *Ударнікам бальшавіцкага друку* у колькасці 3 тыс. экзэмпляраў. Тэкст Канстытуцыі БССР захоўваецца ў навукова-даследчым аддзеле кнігазнаўства, а дзве апошнія кнігі ў агульным сховішчы НББ.

Сістэматычны выпуск беларускіх мініяцюрных кніг пачаўся з 1965 г., калі на Мінскім паліграфічным камбінаце імя Я. Коласа быў надрукаваны зборнік вершаў і песень вядомага паэта-песенніка Адама Русака *Звонкія крыніцы*. Тыраж зборніка – 5 тыс. экзэмпляраў, фармат 100х69 мм.

Пачынаючы з 1960-х гг. і да нашага часу была надрукавана значная колькасць беларускіх мініяцюрных выданняў. У НДА кнігазнаўства захоўваецца каля 200 асобнікаў мініяцюрных кніг, выпушчаныя беларускімі выдавецтвамі.

З ўсёй разнастайнасці беларускай мініяцюрнай кнігі адзначым выпушчаны ў 1999 г. у Мінску *Зборнік вершаў* С. Законнікава, А. Зэкава і А. Пісьмянкова. Гэта сувенірнае выданне толькі ў адным экзэмпляры, памер яго 100х65 мм. Мае цікавы пераплет – сіні аксаміт на кардоне, на пераплеце - скань. Акрамя таго, кніга змяшчае дароўныя надпісы аўтараў. На с.3 надпіс: “Жадаю шчасця! Сяргей Законнікаў”, на с.41 “Пад ветразем кахання - да сэрцаў яднання! Ан. Зэкаў”, на с. 79 “Няхай Вам скрыюць зоры! Алесь Пісьмянкоў”.

***Заг. сектара навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Н. Я. Верас***

Сяргей ЗАКОННІКАЎ

# ЦЁМНЫЯ ВОДЫ ВОСЕНІ

Жадаю шчасця!
Сяргей Законнікаў

Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

# ЛЮБІЦЬ ПРЫЗНАЧАНА МНЕ ЛЁСАМ

Няхай Вам свецяць зоры!
Алесь Пісьмянкоў

Анатоль ЗЭКАЎ

# ВЕТРАЗЬ КАХАННЯ

Пад ветразем кахання-
уся сэрцаў яднанне!
А. Зэкаў

Ба25317+

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Камуністычная партыя (бальшав.) Беларусі

# XXIII ДЗЯРЖЫНСКАЯ РАЁННАЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ

(3—7 мая 1930 г.)

Гомель, 1930 г.

Бел. аддзел 1934 г.
Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна
1953 Ба 25317


Ба25317Т
Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся
Камуністычная партыя (бальшав.) Беларусі
XXIII
ДЗЯРЖЫНСКАЯ
РАЁННАЯ
ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ
(3—7 мая 1930 г.)
Гомель. 1930 г.


Ба17328Т
УДАРНІКАМ
БАЛЬШАВІЦКАГА
ДРУКУ
ВАЖНЕЙШЫЯ
ПАСТАНОВЫ
ПА ПЫТАНЬНЯХ
РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА
РУХУ І ЎДАРНІЦТВА
Ў ДРУКУ
Д.В.Б. Партмассектар. Менск 1932


Ба
17328Т
УДАРНІКАМ
БАЛЬШАВІЦКАГА
ДРУКУ
ДВБ
1932